# Мода ў бібліятэцы

**Выстаўка «FASHION-ілюстрацыя», якая праходзіць у межах штогадовага выставачнага праекта «Гісторыя і сучаснасць кніжнай графікі», адкрылася ў атрыуме Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Праект прадстаўляе гісторыю ўзнікнення і развіцця *fashion*-ілюстрацыі.**

У экспазіцыі — факсімільныя выданні летапісных зводаў з выявамі старадаўніх убораў і зборамі партрэтаў вышэйшых слаёў грамадства. З модай XVIII—XIX стст. наведвальнікі змогуць азнаёміцца праз арыгінальныя аўтарскія гравюры з выявамі жаночых і мужчынскіх касцюмаў, найлепшыя часопісы еўрапейскіх і расійскіх выдаўцоў. Папулярныя вобразы XX ст. прадстаўлены работамі знакамітых Бакста і Эртэ, альбомамі дамоў моды і часопісамі выдавецтваў СССР і БССР, выданнямі *Vogue*, *Harper's Bazaar*, *Marie Claire*, *Elle* з выявамі легендарных мадэлей ад Г. Шанэль, П. Кардэна, І. Сен-Ларана.

Наведвальнікі таксама змогуць убачыць чароўныя акварэлі беларускай *fashion*-ілюстратаркі Веранікі Талецкай, работы студэнтаў кафедры дызайну моды факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ, калекцыю адзення творчага тандэму Вольгі Дзяйко (брэнд «Ежевика») і беларускага мастака Аляксандра Некрашэвіча, вынікі працы таленавітых мастакоў-мадэльераў Таццяны Яфрэмавай, Тамары Гарыдавец, Кацярыны Буцер. Акрамя гэтага, у экспазіцыі прадстаўлены рэчы з асабістай калекцыі Ігара Сурмачэўскага, дэталёвыя рэканструкцыі галаўных убораў, сукенак і сумачак, зробленыя Ганнай Юхнавец, лялькі, апранутыя ў строі розных эпох.

У дзень адкрыцця выставачнага праекта гледачы мелі рэдкую магчымасць убачыць арыгінальнае выданне 1590 года з гравюрамі італьянскага мастака Чэзарэ Вечэліа, на якіх адлюстравана моднае адзенне розных краін свету XVI стагоддзя. Асабліва парадавалі прысутных творчы нумар ад узорнага ансамбля танца «Беларусачка» і модны паказ з удзелам беларускіх фэшн-дызайнераў, зладжаны Нацыянальнай школай прыгажосці.

Выстаўка «*FASHION*-ілюстрацыя» знаёміць з развіццём модных тэндэнцый, з асаблівасцямі мастацкага стварэння і адлюстравання вобразаў моды розных эпох і краін, а таксама творчасцю асоб, якія сыгралі важную ролю ў гісторыі гэтага кірунку творчай дзейнасці. Наведаць экспазіцыю можна да 16 мая 2022 года.

**Дзіяна КАЗІМІРЧЫК**